# РАЗДЕЛ 1. ИСТОЧНИКИ И ИСТОРИОГРАФИЯ ИСТОРИИ БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЕЛЬ «ДОЛГОГО XIX ВЕКА»

*Мікалаева Л. В.*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінск

*Mikalayeva L.*
Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk

**УДК 930.23(476)**

## АДЛЮСТРАВАННЕ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПЕРЫЯДУ КАНЦА XIV – СЯРЭДЗІНЫ XVI СТАГОДДЗЯ Ў ГІСТАРЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ XIX СТАГОДДЗЯ

## REFLECTION OF FOREIGN POLICY OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA OF THE PERIOD OF THE END OF XIV – OF THE MIDDLE OF THE XVI CENTURY EYELID IN HISTORICAL RESEARCHES OF THE XIX CENTURY

*У артыкуле аналізуюцца ключавыя даследаванні знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага канца XIV – сярэдзіны XVI ст. айчынных і замежных аўтараў XIX ст. Робіцца вывад, што найбольш вывучаным з'яўляецца ўсходні напрамак знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага, адносіны з Польшчай і іншыя знешнепалітычныя вектары, перспектыўныя для вывучэння.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае; даследаванне; адносіны; супярэчнасці.*

*The article analyzes the key studies of foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania late XIVth – mid-XVIth c. native and foreign authors of the XIX century. It is concluded that the most studied is the eastern direction of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania, as well as relations with Poland, and other foreign policy vectors are promising for the study.*

*Keywords: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania; a study; relations; contradictions.*

XIX стагоддзе займае пачэснае месца ў гісторыі станаўлення гістарычнай навукі. Для праблем вывучэння разнастайных аспектаў унутранага жыцця Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) і яго знешніх праяў перыяд XIX ст. таксама мае важнае значэнне, паколькі менавіта на працягу яго пачалі з'яўляцца першыя сур'ёзныя даследаванні, заснаваныя на багатым комплексе апавядальных і дакументальных крыніц. XIX ст. стала сапраўдным пачаткам развіцця літуаністыкі як навуковага кірунку гістарычных даследаванняў, а таксама азнаменавалася вылучэннем у ім дзвюх гістарыяграфічных плыняў: расійскай і польскай. Пры гэтым частка прац, што пабачылі свет у XIX ст., не толькі стала класікай літуаністыкі, але і не страціла свайго навуковага значэння ў наш час.

Перш чым звярнуцца да тэмы даследавання, хацелася б адзначыць, што і да сучаснага моманту няма апублікаваных прац, дзе быў бы праведзены комплексны разгляд праблематыкі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. Разам з тым яшчэ ў XIX ст. некаторыя бакі гэтай тэмы знайшлі асвятленне ў публікацыях айчынных і замежных аўтараў, прысвечаных праблемам палітычнай гісторыі ВКЛ, Вялікага Княства Маскоўскага, Польшчы, Лівоніі (Інфлянтаў), Малдаўскага Княства і г. д. З улікам дастаткова вялікай колькасці такіх работ лічым мэтазгодным спыніцца на найбольш цікавых з іх, дзе знайшла адбітак эвалюцыя поглядаў гісторыкаў па пытаннях знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.

Да ліку найбольш вывучаных аспектаў знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. належалі ўзаемаадносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім (з сярэдзіны XVI ст. – Рускім царствам), якія станавіліся прадметам зацікаўлення расійскіх, польскіх, нямецкіх і літоўскіх гісторыкаў. Калі казаць пра расійскую гістарычную літаратуру XIX ст. (а прадстаўлена яна была шматлікімі працамі), то ў ёй амаль у кожным заслугоўваючым увагі творы па гісторыі Расіі ў той ці іншай ступені закраналіся пытанні ўзаемных дачыненняў Вялікага Княства Маскоўскага (пазней – Рускага царства) з ВКЛ. Надзвычайную

цікавасць выклікалі разнастайныя аспекты барацьбы паміж імі за валоданне памежнымі тэрыторыямі, што вылілася ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст. у цэлы шэраг войнаў. Для даследавання знешняй палітыкі ВКЛ аспект добрай вывучанасці яе ўсходняга кірунку мае важнае значэнне, бо дзеянні на дадзеным напрамку аказвалі ўплыў на ўсе астатнія вектары знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ. Дастаткова папулярнымі ў навукоўцаў былі і праблемы адносін ВКЛ з Польшчай, асабліва аспекты, звязаныя з заключэннем уній паміж гэтымі дзяржавамі. Трэба адзначыць, што пры выкладзе матэрыялу даволі моцна адчувалася этнічная прыналежнасць аўтараў і тое, у якой краіне яны пражывалі. Напрыклад, прадстаўнікі Львоўскага польскамоўнага гістарычнага асяродку, які знаходзіўся на тэрыторыі Аўстра-Венгрыі, маглі сабе дазволіць даволі рэзкія ацэнкі ў бок маскоўскай, а затым рускай актыўнасці супраць заходняга суседа. Закраналіся навукоўцамі і пытанні стасункаў ВКЛ з Крымскім ханствам, Малдаўскім Княствам, Тэўтонскім Ордэнам і яго Лівонскай (Інфлянцкай) філіяй. Пэўная ўвага была звернута і на пытанні кіраўніцтва сферай знешняй палітыкі ў ВКЛ. Аднак актывізацыя даследаванняў апошніх аспектаў адбылася толькі пад канец XIX ст. Па ступені асвечанасці яны некалькі саступалі пытанням маскоўска-ліцвінскіх і польска-ліцвінскіх ўзаемаадносін.

Да ліку заслуг расійскіх і польскіх гісторыкаў канца XVIII – першай паловы XIX ст. можна аднесці выяўленне і ўключэнне ў навуковы зварот асноўнай часткі крыніц па гісторыі ўзаемаадносін ВКЛ са сваімі суседзямі і некаторымі іншымі краінамі за перыяд канца XIV – сярэдзіны XVI ст. Дзякуючы намаганням М. М. Бантыш-Каменскага (1737–1814), які з 1762 г. пачаў працаваць, а з 1800 г. узначаліў Маскоўскі архіў Калегіі замежных спраў, яшчэ ў 1780–1784 гг. быў падрыхтаваны агляд пасольскіх кніг, у якіх быў зафіксаваны матэрыял па дыпламатычных стасунках Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ і Польшчай у 1487–1584 гг., надрукаваны толькі ў 1860-х гг. [1].

Напрацоўкі М. М. Бантыш-Каменскага пазней былі выкарыстаны М. М. Карамзіным (1766–1826) пры стварэнні адной з першых абагульняючых прац па гісторыі Расіі – 12-томнай «Истории государства Российского», напісанай на аснове шырокай базы крыніц [2]. Змест гэтай працы дазваляе разглядаць яе аўтара фактычна як прадцечу таго кірунку ў гістарыяграфіі, што атрымаў назву гістарыцызм. Работа М. М. Карамзіна – гэта выклад палітычнай гісторыі Вялікага Княства Маскоўскага як нашчадка Кіеўскай і Уладзімірскай Русі. Фактычна цэнтрам яго даследавання з’яўлялася дзяржава. Аднак, калі крытычна аднесціся да твора, то можна зазначыць, што ў яго аўтара не было тэарэтычнай канцэпцыі і нават кіруючай цэнтравой ідэі, хаця ён аддаў даніну рацыяналізму і нават шукаў псіхалагічныя матывацыі дзеянняў сваіх герояў. Але яго метады былі накіраваны толькі на знаходжанне сувязяў паміж дзеяннямі ў мінулым. Таму М. М. Карамзін устанавіў факты, але не даў іх інтэрпрэтацыі, не вызначыў сапраўдную прычыннасць (у прыватнасці, ён сур’ёзна прымаў заявы Івана III пра рэлігійныя матывы пачатку вайны з ВКЛ у 1500 г.), толькі пастараўся інтуітыўна зразумець тое, што адбывалася. У выніку ў працы М. М. Карамзіна характарыстыка гістарычнага працэсу ператварылася ў яго тлумачэнне, а гісторыя народа – у гісторыю дзяржавы. Разам з тым ён выступіў наватарам у форме выкладання матэрыялу, якое вызначалася красамоўствам і апавядальнасцю. Каштоўнасць твору М. М. Карамзіна дадавалі яго каментарыі, у якіх утрымліваліся выпіскі з выкарыстаных ім рукапісаў, частка з якіх у наш час ужо страчана. Такім чынам, менавіта яму ўдалося апублікаваць іх упершыню і захаваць для нашчадкаў.

У гэты ж час можна адзначыць пачатак актывізацыі польскамоўных даследчыкаў праблем знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. Пачынальнікам сур’ёзнага навуковага падыходу да вывучэння заяўленай праблемы ў польскай гістарычнай навуцы можа лічыцца «бацька польскай рамантычнай гістарыяграфіі» і заснавальнік т. зв. «лелявелеўскай» гістарычнай школы І. Лялевель (1786–1861), у свой час прафесар Віленскага ўніверсітэта, аўтар даследаванняў па палітычнай гісторыі ВКЛ і Польшчы, у якіх важнае месца займалі ўзаемадачыненні паміж гэтымі дзяржавамі [3].

Сучаснікам І. Лялевеля быў аўтар першай працы па гісторыі Літвы (ад старажытнасці да 1572 г.), дзе яна разглядалася асобна ад Польшчы, Т. Нарбут (1784–1864). Пытанні знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. разгледжаны аўтарам ў пяці апошніх тамах твора [4]. Т. Нарбут упершыню апублікаваў у поўным аб’ёме і выкарыстаў у сваім даследаванні «Хроніку Быхаўца» [5]. Па багацці факталагічнага матэрыялу манаграфія Т. Нарбута саступае працы М. М. Карамзіна, якую літоўскі польскамоўны аўтар часам выкарыстоўваў у якасці асноўнай крыніцы, хаця і палемізаваў з яе аўтарам. Гэта спрэчка была працягнута ў другой палове XIX ст. новым пакаленнем расійскіх і польскіх даследчыкаў.

Галоўным прадстаўніком гістарыцызму ў Расіі з’яўляўся С. М. Салаўёў (1820–1879), аўтар працы «История России с древнейших времен» у 29 тамах. Пытанні знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. былі адлюстраваны ў 4, 5 і 6 тамах твора [6]. С. М. Салаўёў упершы-

ню загаварыў аб заканамернасцях гістарычнага працэсу і пачаў разглядаць знешнюю палітыку Вялікага Княства Маскоўскага канца XIV – сярэдзіны XVI ст. у сувязі з унутрыпалітычнымі працэсамі. Там, дзе М. М. Карамзін бачыў сутыкненне характараў ваюючых уладароў – Казіміра, Аляксандра, а потым і Жыгімонта – з аднаго боку, і Івана III, Васіля III – з другога, С. М. Салаўёў угледзеў глыбокую розніцу ў дзяржаўнай будове Вялікага Княства Маскоўскага і ВКЛ, якая тлумачыла ваенную перавагу першай. Акрамя таго, яшчэ да з'яўлення манаграфічных даследаванняў па гісторыі ВКЛ ён змясціў у пятым томе сваёй працы, у главе пра ўнутраны стан маскоўскага грамадства пры Іване III, і нарыс унутранага жыцця ўсходнеславянскіх зямель ВКЛ, дзе асвятляліся будова, лад жыцця грамадства, дзейнасць органаў судаводства, якія не страцілі актуальнасці і ў наш час.

Адным з вучняў С. М. Салаўёва быў В. В. Ключэўскі (1841–1911), які пакінуў адметны след у рускай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Сярод яго твораў для разглядаемай праблематыкі трэба выдзеліць «Курс русской истории» ў 5 частках, які атрымаў шырокае прызнанне [7]. У гэтай абагульняючай працы В. В. Ключэўскі прадэманстраваў праблемнае выкладанне рускай гісторыі. Так, асобную лекцыю № 25 навуковец прысвяціў тэрытарыяльным набыткам вялікага князя маскоўскага Івана III і яго пераемнікаў, закрануўшы праблему ўзаемаадносін Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ. Таксама дастаткова павярхоўна і схематычна, падобна як і ў працах М.М. Карамзіна і С. М. Салаўёва, В.В. Ключэўскі адлюстраваў і стасункі ВКЛ з Малдаўскім Княствам, разгледзеўшы іх у асноўным скрозь прызму дынастычнай палітыкі.

У 1857 г. у Санкт-Пецярбургу выйшла праца І. В. Турчыновіча «Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен» [8], у якой знайшлі адбіццё і пытанні знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. Нягледзячы на тое, што шэраг крыніц гэтага твора былі ўпершыню выкарыстаны аўтарам, даследаванне І. В. Турчыновіча ў многім з'яўлялася кампілятыўным, складзеным на аснове прац М. М. Карамзіна і Т. Нарбута, і не мела высокай навуковай вартасці.

Напярэдадні паўстання 1863–1864 гг. пабачыла свет кніга прадстаўніка кракаўскай гістарыяграфічнай школы Ю. Шуйскага (1835–1883), пабудаваная з прыцягненнем польскіх крыніц [9]. Асноўная ўвага ў ёй была нададзена праблемам узаемаадносін ВКЛ з Польшчай. Войны ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім былі разгледжаны дастаткова павярхоўна і схематычна. Разам з тым услед за Т. Нарбутам Ю. Шуйскі працягнуў спрэчку з меркаваннямі, выказанымі ў даследаванні М. М. Карамзіна. Як і літоўскі гісторык, Ю. Шуйскі паставіў пад сумненне рэлігійную матывацыю пачатку вайны паміж Вялікім Княствам Маскоўскім і ВКЛ у 1500 г. Прычынай страты Смаленска ў 1514 г. Ю. Шуйскі назваў здраду гарнізона і інтрыгі князя М. Глінскага, а не сімпатыі смаленчукоў да Васіля III і яго падданых [9, s. 159, 160, 225].

Першай манаграфіяй па гісторыі руска-літоўскіх адносін у 1462–1508 гг. стала апублікаваная ў 1867 г. частка магістарскай дысертацыі Г. Ф. Карпава [10]. Праца значна саступала фактalагічнай насычанасцю «Истории» С. М. Салаўёва, не вызначалася глыбокім аналізам. Г. Ф. Карпаў не змог правільна ацаніць значэнне матэрыялаў «Метрыкі» ВКЛ для вывучэння дадзенага пытання, палічыўшы іх толькі нязначным дапаўненнем да маскоўскай пасольскай дакументацыі [10, с. IV], не выкарыстаў ён і інфармацыю польскіх хронік. Па сутнасці, ён толькі паўтарыў ужо вядомыя факты тагачаснай дыпламатычнай гісторыі. У хуткім часе дадзеная праца страціла сваё навуковае значэнне.

Між тым, пачынаючы з 1870-х гг., з'явіўся цэлы шэраг прац польскіх даследчыкаў, у якіх разглядаліся розныя аспекты знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. У канцы XIX ст. адбылася актывізацыя даследаванняў ўзаемаадносін Каралеўства Польскага з Вялікім Княствам Літоўскім, калі пабачылі свет працы такіх гісторыкаў, як граф К. Стадніцкі (1808–1886) [11], А. Лявіцкі (1841–1899) [12], Ф. Чорны (1847–1917) [13], М. Бобжыньскі (1849–1935) [14], К. Костра-Пулаўскі (1846–1926) [15] і інш. Да гэтага часу адносілася і выданне шматтомнай сінтэтычнай працы па гісторыі Польшчы і ВКЛ ураджэнца Гнезна Я. Каро (1835–1904) [16], перакладзенай на польскую мову яшчэ пры жыцці аўтара. У канцы XIX ст. А. Лявіцкім была сфармулявана тэорыя інкарпарацыі, у адпаведнасці з якой пасля Крэўскага акта ВКЛ перастала існаваць як дзяржава і былоператворана ў шэраг правінцый Каралеўства Польскага, і толькі дагавор з Тэўтонскім ордэнам на в. Салін у 1398 г. і акты Віленска-Радамскай уніі 1401 г. рэанімiравалі яго як асобную дзяржаву [17]. Тым самым быў пакладзены пачатак дыскусіі па пытанні аб рэальнасці інкарпарацыі ВКЛ. Прадметам даследавання ў гэты час стаў і характар Крэўскага акта 1385 г. На думку Ф. Канечнага (1862–1949), гэта была ўжо «ратыфікацыя папярэдніх пагадненняў» [18, s. 194].

Значным крокам наперад у вывучэнні кантактаў ВКЛ з Малдаўскім Княствам стала з'яўленне ў 1870–1880-х гг. прац польскіх гісторыкаў А. Яблаўскага (1829–1913) [19], А. Барэмскага (1866 – ?) [20], А. Прахаскі (1852–1930) [21].

Аб'ядноўвае гэтыя працы імкненне іх аўтараў разглядаць польска-малдаўскія і ліцвінска-малдаўскія адносіны як адзінае цэлае, што з'яўлялася наступствам працяглых перыядаў існавання персанальнай уніі паміж Польшчай і ВКЛ, калі на чале іх знаходзіўся адзін манарх, ад імя якога і ажыццяўляліся дыпламатычныя кантакты. Гэтыя працы адыгралі важную ролю для свайго часу, але ў наш час ужо дастаткова састарэлі, хаця польскія даследчыкі часам яшчэ працягваюць іх выкарыстоўваць.

Не абышлі ўвагай польскія даследчыкі і некаторыя маладаследаваныя і ў наш час кірункі знешняй палітыкі ВКЛ. Адносінам ВКЛ са Свяшчэннай Рымскай імперыяй германскай нацыі ў 1420–1430-х гг. былі прысвечаны працы А. Лявіцкага [22]. Адносіны з Францыяй аналізаваў А. Хіршберг (1847–1907) [23]. Канфлікты з Крымскім ханствам і кантакты ВКЛ з Вялікай (Заволжскай) Ардой абмяркоўваліся К. Костра-Пулаўскім [24]. Такім чынам, праблематыка, звязаная з цэлым шэрагам аспектаў знешняй палітыкі ВКЛ, атрымала навуковую апрабацыю. Усебаковы аналіз становішча ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., вялікі фактычны матэрыял, пачэрпнуты ў архівах Польшчы і іншых краін, – усё гэта надало высокую навуковую каштоўнасць працам польскіх даследчыкаў.

З 1890-х гг. і расійскімі гісторыкамі пачалося сістэматычнае вывучэнне крыніц прымяняльна да гісторыі непасрэдна ВКЛ. У гэты час у навуковы зварот сталі ўводзіцца матэрыялы «Метрыкі» ВКЛ, а фундаментальныя працы М. К. Любаўскага (1860–1936) [25; 26] і грунтоўныя даследаванні М. В. Доўнар-Запольскага (1867–1934) [27–29], створаныя ў канцы XIX ст., захавалі сваю значнасць і да нашых дзён.

Вялікую цікавасць для вывучаемай тэмы мае праца М. К. Любаўскага «Литовско-русский сейм», якая была прысвечана даследаванню гісторыі ўзнікнення, станаўлення і развіцця гэтага дзяржаўна-палітычнага інстытута, высвятленню яго функцый і прэрагатыў, а таксама ўплыву рашэнняў соймаў на ўнутры- і знешнепалітычнае жыццё дзяржавы [26]. Расійскі вучоны падрабязна даследаваў і ролю сойма ВКЛ у сферы кіраўніцтва зешняй палітыкай і дыпламатыяй дзяржавы. Па багацці сабранага ў ёй матэрыялу капітальная манаграфія М. К. Любаўскага да гэтага часу не мае сабе роўных.

Самавітыя навуковыя даследаванні названых аўтараў абапіраліся пераважна на дакументальныя крыніцы па гісторыі ВКЛ і сталі своеасаблівай вяршыняй у развіцці расійскай (часткова беларускай) гістарыяграфіі канца XIX ст. [30].

Такім чынам, розныя аспекты гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. цікавілі даследчыкаў, працы якіх былі створаны ў XIX ст. Расійскія, польскія, літоўскія, нямецкія гісторыкі дэманстравалі самы шырокі дыяпазон меркаванняў па разглядаемай праблематыцы, закранаючы ў навуковых даследаваннях разнастайныя яе пытанні. Зроблены імі задзел стаў базай для працягу даследаванняў у наступны перыяд.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Бантыш-Каменский, Н. Н.* Переписка между Россиею и Польшею по 1700 год, составленная по дипломатическим бумагам… / Н. Н. Бантыш-Каменский // Чтения в Обществе истории и древностей российских при Московском университете. – 1860. – Т. 4. – С. I–VIII, 1–189.

2. *Карамзин, Н. М.* История государства Российского: репринтное воспроизведение издания 1842–1844 гг. в трех книгах с приложением / Н. М. Карамзин. – М.: Книга, 1989. – Кн. 2, т. V–VIII. – 242, 228, 142, 188 стлб.

3. *Lelewel, J.* Dzieje Litwy i Rusi aż do unji z Polską w Lublinie 1569 zawartej / J. Lelewel. – Poznań: Nakładem i drukiem W. Stefańskiego, 1844. – 202 s.; *Lelewel, J.* Dzieła / J. Lelewel. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1962. – T. 6: Historia polska do konca panowania Stefana Batorego; oprac. Z. Kolankowski. – 540 s.

4. *Narbutt, T.* Dzieje starozytne narodu litewskiego / T. Narbutt. – Wilno: A. Marcinowski, 1839–1841. – T. 5: Od smierci Gedymina do bitwy nad Worsklą. – 691 s.; T. 6: Panowanie Witolda w wieku piętnastym. – 632 s.; T. 7: Panowanie Świdrygiełły i Zygmunta. – 419 s.; T. 8: Panowania Kazimierza i Alexandra. – 555 s.; T. 9: Panowania Zygmuntów. – 534 s.

5. Pomniki do dziejów litewskich. Pod względem historycznym, dyplomatycznym, geograficznym, statystycznym, obyczajowym, orcheograficznym i t. p. Z różnych rękopisnych lub rzadkich wydań dziejopisów, tudzież dyplomatów i dalszych zabytków przeszłości odkrytych, w archiwach tajnych królewieckich, tudzież w archiwach ryskich i innych krajowych. Zebrane przez T. Narbutta; z ryciną i facsimille. – Wilno: R. Rafałowicz, 1846. – VI, 90 s.

6. *Соловьев, С. М.* История России с древнейших времён: в 15 кн. / С. М. Соловьев. – М.: Соцэкгиз, 1960. – Кн. 2, т. 3–4. – 781 [1] с.; Кн. 3, т. 5–6. – 814 [1] с.

7. *Ключевский, В. О.* Курс русской истории / В. О. Ключевский. – СПб.: [б. и.], 1904. – 1146 с.

8. *Турчинович, И. В.* Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен / И. В. Турчинович. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1857. – XII, 303 с.

9. *Szujski, J.* Dzieje Polski podług ostatnich badań spisane przez Józefa Szujskiego / J. Szujski. – Lwów: Nakładem Karola Wilda, 1862. – T. 2: Jagielloni. – 340 s.

10. *Карпов, Г. Ф.* История борьбы Московского государства с польско-литовским. 1462–1508. Часть вторая / Г. Ф. Карпов. – М.: Университет. тип., 1867. – 164 с.

11. *Stadnicki, K.* O tronie elekcyjnym domu Jagiellonów w Polsce / K. Stadnicki. – Lwów: Nakładem Autora, 1880. – 102 s.

12. *Lewicki, A.* Sprawa unii kościelnej za Jagiełły / A. Lewicki // Kwartalnik Historyczny. – Kraków: Towarzystwo Historyczne, 1887. – № 11. – S. 311–312, 326; *Lewicki, A.* Nieco o unii Litwy z Koroną / A. Lewicki // Przegląd Polski. – 1893–1894. – R. 28, т. II. – S. 235–280.

13. *Czerny, F.* Panowanie Jana Olbrachta i Aleksandra Jagiellończyka (1492–1506) / F. Czerny. – Kraków: Nakładem Autora, 1871. – 140 s.

14. *Bobrzyński, M.* Dzieje Polski w zarysie / M. Bobrzyński. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1879. – 495 s.

15. *Pułaski, K.* Przyczynek do elekcyi Zygmunta I w Litwie i w Polsce / K. Pułaski // Szkice i poszukiwania historyczne przez K. Pułaskiego. – Kraków: Żupański, 1887. – Serya I. – S. 71–73.

16. *Caro, J.* Geschichte Polens / J. Caro. – Gotha: Perthes, 1886. – Bd. 5. H. 1. 1455–1480. – XIII, 500 s.; *Caro, J.* Dzieje Polski / J. Caro; przelozył z języka niemieckiego S. Mięczyński. – Warszawa: Skład głowny w księgarni E.Wendego i spółki, 1900. – T. 6: 1481–1506. – 431 s.

17. *Lewicki, A.* Powstanie Świdrygiełły: ustęp z dziejów unii Litwy z Koroną / A. Lewicki // Rozprawy Akademii Umiętjetności. Wydział Historyczno-Filozoficzny. Serya II. – 1892. – T. IV (XXIX). – S. 128–516.

18. *Koneczny, F.* Jagiełło i Witołd (1382–1392) / F. Koneczny // Przewodnik naukowy i literacki. – 1892. – R. XX. – T. XX. – Z. I. Styczen. – S. 1–1096.

19. *Jabłonowski, A.* Sprawy Wołoskie za Jagiellonów: Akta i listy wydał i szkicem historycznym poprzedził, Aleksander Jabłonowski / A. Jabłonowski // Źródła dziejowe w 24 t. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1876–1915. – T. 10. – 1878. – 4 p. l., III CLXIV, 163 s.

20. *Borzemski, A.* Sprawa pokucka za Aleksandra / A. Borzemski // Pszegląd Powszechny. – VI. – 1889. – T. XXIV. – S. 169–186, 361–380.

21. *Prochaska, A.* Sprawy wołoskie w wieku XV / A. Prochaska // Pszewodnik Naukowy i Literacki. – XVI. – 1888. – S. 787–796, 901–912, 1006–1016, 1057–1073.

22. *Lewicki, A. Przymierze Zygmunta W. Ks. Litewskiego z królem rzymskim Albrechtem II* / A. Lewicki // Rozprawy Akademii Umięjetności. Wydział Historyczno-Filozoficzny. Serya II. – 1899. – T. XII (XXXVII). – S. 292–319; *Lewicki, A. Król Zygmunt Luksemburski a Polska 1420–1436* / A. Lewicki // Kwartalnik Historyczny. – Kraków: Towarzystwo Historyczne, 1896. – № 10. – S. 67–91.

23. *Hirschberg, A.* Koalicja Francji z Jagiellonami z r. 1500 / A. Hirschberg // Pszewodnik Naukowy i Literacki. – X. – 1882. – S. 1129–1151.

24. Stosunki z Mengli-Girejem chanem Tatarów Perekopskich (1469–1515): Akta i listy wydał i szkicem historycznym poprzedił Kazimierz Pułaski // Stosunki Polski z Tatarszczyzną od polowy XV wieku. – Kraków: Gebethner i spólka; Warszawa: Gebetner i Wolff, 1881. – T. 1. – 449 s.

25. *Любавский, М. К.* Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута. Исторические очерки / М. К. Любавский. – М.: Университет. тип., 1892. – 884, [106] с.

26. *Любавский, М. К.* Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М. К. Любавский. – М.: Изд-во Имп. о-ва ист. и Древн. Рос. при Моск. ун-те, 1900. – 850, 232 с.

27. *Довнар-Запольский, М. В.* Заметки о крымских делах в Метрике Литовской / М. В. Довнар-Запольский. – Б. м., б. д. – 13 с.

28. *Довнар-Запольский, М. В.* Литовские упоминки татарским ордам. Скарбовая книга Метрики Литовской 1502–1509 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Симферополь: Тип. Спиро, 1898. – 91 с.

29. *Довнар-Запольский, М. В.* Польско-литовская уния на сеймах до 1569 года: Исторический очерк / М. В. Довнар-Запольский. – М.: Тип. Г. Лисснера и А. Гешеля, 1897. – 28 с.

30. *Галенчанка, Г.* Гістарыяграфія / Г. Галенчанка // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя. – 688 с.: іл.

**Дата паступлення: 25.09.2018.**